Будзь у курсе

# Рэгістраваць шлюб можна будзе ў любым месцы краіны незалежна ад пражывання

## Папраўкі ў Кодэкс аб шлюбе і сям'і

**Каб зразумець ролю сям'і ў нашым жыцці, дастаткова шчыра адказаць на пытанне: «Каму мы патрэбныя на гэтай зямлі, акрамя нашых родных?». Менавіта сям'я дае нам апору, падтрымку, цяпло, першыя ўрокі кахання. Чым больш шчаслівых сем'яў, тым больш паспяховае грамадства ў цэлым. Да ўсяго іншага, сям'я павінна быць надзейна абаронена законам. Заканадаўчая база, што рэгулюе шлюбна-сямейныя адносіны, пастаянна ўдасканальваецца. Вось і нядаўна беларускія сенатары адобрылі папраўкі ў Кодэкс аб шлюбе і сям'і.**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Як адзначае **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ніна ФЕДАРУК,** гэты дакумент у першую чаргу накіраваны на ўмацаванне сямейных адносін, ахову мацярынства, бацькоўства і абарону правоў дзіцяці.

### Новыя падыходы да рэгістрацыі шлюбу

Спецыялісты адкарэктавалі 120 артыкулаў кодэкса. Сярод навін законапраекта — новыя падыходы да рэгістрацыі шлюбу. У прыватнасці, скарачэнне тэрміну заключэння шлюбу з пятнаццаці да трох дзён з дня звароту ў ЗАГС. У выключных выпадках (цяжарнасць, нараджэнне агульнага дзіцяці або асаблівыя абставіны) — у дзень звароту. Рэгістраваць заключэнне шлюбу можа любы орган, які рэгіструе акты грамадзянскага стану, па выбары асоб, якія ўступаюць у шлюб, як у памяшканні органа, так і за яго межамі. Пры гэтым рэгістраваць шлюб можна ў любым месцы краіны (у тым ліку памятных месцах — такіх, як, напрыклад, Мірскі замак і інш.), незалежна ад пражывання будучых мужа і жонкі або іх бацькоў.

У новай рэдакцыі выкладаецца 13 артыкул «Шлюбны дагавор». У ім прадугледжваюцца ўмовы маёмаснага і немаёмаснага характару, узаемныя правы і абавязкі мужа і жонкі і г.д. Вызначаецца момант спынення шлюбнага дагавора і ўмовы яго змянення.

### У выпадку скасавання шлюбу

Суд вызначыць, у выпадку скасавання шлюбу, з кім будуць жыць дзеці, калі гэтае пытанне не ўрэгулявана пагадненнем аб дзецях. Таксама суд будзе абавязаны ўлічыць жаданне дзіцяці, пачынаючы з 10-гадовага ўзросту, у дачыненні да ўстанаўлення парадку яго зносін са сваякамі і бацькамі, пазбаўленымі бацькоўскіх правоў, пры аднаўленні апошніх у правах. Акрамя таго, пры выбары папячыцеля і апекуна і пры перадачы дзіцяці на патранатнае выхаванне і ў сямейны дзіцячы дом.

Артыкул 24 дапаўняецца нормай аб тым, што рэчы індывідуальнага карыстання непаўналетніх дзяцей (адзенне, абутак, школьныя прылады, музычныя інструменты і да т.п.) пры раздзеле маёмасці мужам і жонкай у выпадку скасавання шлюбу не ўлічваюцца і перадаюцца без кампенсацыі таму, з кім будуць пражываць дзеці.

Замацаваны абавязак мужа (былога мужа) прадаставіць утрыманне асобе, якая ажыццяўляе догляд за агульным дзіцем-інвалідам да дасягнення дзіцем 18 гадоў і непрацаздольным паўналетнім дзіцем.

«У законапраекце чырвонай ніткай праходзіць **падтрымка дзяцей-інвалідаў як да 18 гадоў, так і пасля дасягнення імі паўналецця,** — кажа Ніна Федарук. — Бо нярэдка бывае так, што пасля 18 гадоў непрацаздольнае дзіця-інвалід застаецца сам-насам са сваімі праблемамі. Усё, што ў яго ёсць, — гэта пенсія па інваліднасці і падтрымка маці, якой цяжка гадаваць яго адной. Цяпер, згодна з папраўкамі ў кодэкс, бацька павінен будзе ўтрымліваць такое дзіця і пасля дасягнення ім 18 гадоў».

Законапраектам рэгулююцца аліментныя абавязацельствы шляхам заключэння пагаднення аб дзецях, пагаднення аб выплаце аліментаў, шлюбнага дагавора. У мэтах абароны матэрыяльных інтарэсаў дзяцей, бацькі якіх знаходзяцца ў разводзе, усталёўваецца новы разлік запазычанасці па выплаце аліментаў, зыходзячы з сярэдняй заработнай платы работнікаў у рэспубліцы.

Рэгістрацыя скасавання шлюбу пры ўмове ўзаемнай згоды мужа і жонкі, якія не маюць агульных непаўналетніх дзяцей і спрэчкі аб маёмасці, будзе праводзіцца органам ЗАГСа (гэтая норма ўступіць у сілу з 1 студзеня 2013 года).

### Падтрымка дзяцей-сірот, дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў

Асобныя палажэнні артыкулаў законапраекта накіраваны на падтрымку дзяцей-сірот, дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. Прыярытэтным з'яўляецца ўладкоўванне іх на выхаванне ў сям'ю — гэта ўсынаўленне, прыёмная сям'я, апякунская сям'я і дамы сямейнага тыпу, і толькі пры адсутнасці такой магчымасці — у дзіцячыя інтэрнатныя ўстановы.

Абноўлены дакумент устанаўлівае максімальную ўзроставую розніцу — 45 гадоў — паміж дзіцем, якое ўсынаўляецца, і ўсынавіцелем. Дапоўнены пералік падстаў для адмовы ў прызначэнні ўсынавіцелем, апекуном, папячыцелем і прыёмным бацькам, бацькам-выхавальнікам асобамі, хворымі на хранічны алкагалізм, наркаманію і таксікаманію. У законапраекце паказана, што орган апекі і папячыцельства павінен сачыць за выкананнем абавязкаў прыёмных бацькоў, а таксама бацькоў-выхавальнікаў па ўтрыманні і выхаванні дзяцей.

**Пералік органаў, якія ажыццяўляюць абарону правоў,** што вынікаюць са шлюбных і сямейных адносін, дапоўнены камісіяй па справах непаўналетніх і пракуратурай.

**Святлана БУСЬКО.**

# АД БЭТЛЕЕМА ДА ЧАЛАВЕЧАГА СЭРЦА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ад часу нараджэння Езуса Хрыста гэтая ласка ўжо не закрытая, але з'явілася ў чалавечым целе і паказала свой твар, бо Нараджэнне Божае — гэта аб'яўленне Бога з чалавечым тварам і сэрцам. Дзякуючы гэтай ласцы чалавек здольны адмовіцца ад пошуку шчасця па-за Богам.

Гэтая ласка была аб'яўлена ўсім людзям, і таму ўсім дае новую надзею, бо толькі яна можа перамяніць зло ў дабро, можа змяніць чалавечае сэрца і ўчыніць з яго аазіс спакою.

Хоць Божая ласка з'явілася ўсім, аднак не ўсе яе ўбачылі і прынялі. Чаму так ёсць? Таму што не хацелі і не хочуць гэтага.

Таямніцу Богаўцелаўлення можна прыняць толькі ў духу веры. У той жа час сёння з гэтай праўды часта выдаляецца яе рэлігійны змест. Сучасны сусветны гандаль, які не мае нічога супольнага з рэлігіяй, Божае Нараджэнне распачынае ў лістападзе і, з мэтай заахвочвання кліентаў да пакупкі, выкарыстоўвае нават рэлігійную сімволіку. Яна, пазбаўленая свайго першаснага духоўнага значэння, уключаецца ў машыну рэкламы і камерцыі. Рэлігійныя сімвалы служаць нерэлігійным мэтам. Святыя рэчы зводзяцца да ўзроўню тавару. Такім чынам, свет камерцыі прысвоіў сабе Божае Нараджэнне з усімі яго рэквізітамі, акрамя аднаго: ён выкінуў з гэтага свята галоўнага пратаганіста — Езуса.

На жаль, у некаторых краінах з вельмі багатай гісторыяй хрысціянства ў іх так званай паліткарэктнасці, якая ўжо дабралася і да рэлігіі, заўважаецца тэндэнцыя выпустошвання свята Божага Нараджэння з хрысціянскай сутнасці. Усё часцей замест паштовак з тэкстам віншаванняў з Божым Нараджэннем з'яўляюцца паштоўкі з «сезонным віншаваннем» — Season's greetings. Знікаюць з публічных месцаў стаенкі і ёлкі з рэлігійнымі сімваламі. Гэта яўная тэндэнцыя выкінуць веру з публічнага жыцця людзей і ўчыніць яе толькі прыватнай справай.

Яшчэ ў IV стагоддзі св. Грыгорый Назіянскі ў сваёй казані на Божае Нараджэнне супрацьпастаўляў хрысціянскае яго святкаванне язычніцкаму. Ён казаў: «Ушануйма гэтае свята не кірмашным спосабам, але боскім; не па-свецку, але звышпрыродна; не як нашае, але як Таго, хто ёсць нашым Панам».

Камерцыя, спажывецкая культура і паліткарэктнасць у рэлігійных справах моцна ўплываюць як на падрыхтоўку да святаў, так і на само іх святкаванне. Закупкі, падарункі, гасцінцы і г. д. з'яўляюцца прычынай таго, што Божае Нараджэнне траціць сваё духоўнае вымярэнне і не пакідае ніякага следу ў нашым жыцці. Прыйшло і прайшло.

Ці такім павінен быць хрысціянскі спосаб святкавання Божага Нараджэння? Ці дастатковай будзе знешне прыгожая атмасфера з непакоем у сэрцы? Ці не павінен хрысціянін у такім «клімаце» задумацца над тым, што з ім робіцца? Ці не павінен задумацца над таямніцай Богаўцелаўлення? Ці не павінен спытаць самога сябе, якое значэнне ў яго жыцці мае той факт, што больш за дзве тысячы гадоў таму Бог стаўся чалавекам і што Хрыстус кожны дзень нараджаецца для яго ў Касцёле?

Таму, калі спажывецкая і ліберальная культура імкнуцца выкінуць хрысціянскія сімвалы са святкавання Божага Нараджэння, нам трэба старацца лепей зразумець сэнс гэтага свята і каштоўнасць яго традыцый, якія належаць да спадчыны нашай веры і культуры, каб іх перадаць новым пакаленням і развіваць далей.

Свята Божага Нараджэння павінна стаць тэстам на нашу хрысціянскую тоеснасць, а менавіта, ці хочам мы сапраўды жыць Божай ласкай або толькі прытрымліваемся традыцый схадзіць у касцёл, купіць дзецям падарункі, павіншаваць блізкіх, а ў штодзённым жыцці застаёмся падобнымі да няверуючых. Больш гуманны свет, пачаткам якога ёсць Божае Нараджэнне, — гэта свет, у якім жыве новы чалавек, здольны супрацьстаяць выклікам часу, асабліва міражам матэрыялізму і кансумізму; супярэчнаму з воляй Божай выкарыстоўванню дасягненняў навукі і тэхналогіі; імкненню да абсалютнай свабоды без Бога; лібералізму ў справах этыкі; абагаўленню амаральных прыемнасцяў і г. д.

Адзін місіянер працаваў у афрыканскай вёсцы, дзе не было вады. Яе трэба было насіць вельмі далёка з ракі. Ён заахвоціў людзей зрабіць артэзіянскую студню, каб заўсёды мець свежую і чыстую ваду. З дапамогай дабрачынных арганізацый яны рэалізавалі гэты праект. Аднойчы місіянер зайшоў у дом, дзе жыла пажылая жанчына, і папрасіў у яе кубак чыстай вады. Са здзіўленнем ён пачуў, што ў хаце няма пітной вады. «Чаму? — спытаўся місіянер. — Усе ж маюць». «Так, усе маюць, — адказала жанчына. — Але праблема ў тым, што мой унук, з якім я жыву, ленуецца прынесці ваду з артэзіянскай студні».

Вось той пункт, у якім знаходзіцца сучасны чалавек! Можна памерці ад недахопу вады там, дзе яе дастаткова. Чаму? Таму, што вада не з'явіцца нашай, пакуль мы самі не прыйдзем да яе крыніцы, каб узяць тое, што нам належыць. Каб заспакоіць нашу смагу і напіцца вады, нам найперш трэба рэалізаваць наша права на ваду.

Падобна і з праўдай Божага Нараджэння. Нам трэба прыняць яе і адчуць у нашым жыцці, у нашых сем'ях, у нашым грамадстве і ва ўсім свеце.

Калі мы разважаем над цудам Божага Нараджэння, то вельмі варта пагледзець, як паводзілі сябе розныя катэгорыі людзей, якія непасрэдна былі звязаны з гэтай падзеяй.

З негатыўнага боку паўстае гаспадар гасцініцы, які не ўпусціў цяжарную Марыю і Юзафа, кажучы, што няма месца. Таксама і Ірад, які быў гатовы забіць немаўлятка Езуса, бо ў ім бачыў пагрозу свайму валадаранню.

Пазітыўна прадстаўляюцца простыя пастушкі, якія пакінулі свой статак і паспяшаліся, каб убачыць народжанага Збаўцу. Таксама і Тры Каралі — вучоныя мужы з Усходу — якія прайшлі доўгі і небяспечны шлях да Бэтлеема, каб пакланіцца Езусу і прынесці Яму свае дары. Яны, а не фарысеі і кіраўнікі габрэйскага народа, атрымалі ласку ўбачыць уцелаўлёнага Бога.

Пры нараджэнні Збаўцы не было шпіталя і месца ў заездзе. Не было прафесійнай медыцынскай апекі. Не было гучнага прывітання новананароджанага. Не было віншаванняў. Не было дастаткова цяпла. Не было вадаправода. Не было электрычнасці. Але было дастаткова любові, бо без яе жыццё было б непераносным. Таму Божае Нараджэнне — гэта пацалунак Бога з зямлёй, які прынёс людзям новую надзею.

А як з намі? Ці мы сапраўды бачым нованароджанага Збаўцу? Ці з патрэбы душы спяшаемся пакланіцца яму? А можа, толькі аддаём даніну традыцыі? У выніку чаго пад ёлкай знаходзіцца ўсё больш бліскучых і дарагіх падарункаў, але паміж намі няма Бога, які нам у падарунку ахвяраваў самога сябе. Калі такой, пабудаванай самім чалавекам, будзе наша вера, то яна не будзе сапраўднай, бо будзе пазбаўлена духоўных каштоўнасцяў, а грамадства без Бога застанецца скажоным.

Бог першы выйшаў нам насустрач і паказаў сваё багатае на ласку і міласэрнасць аблічча. Яго прышэсце ў свет павінна змяняць нас. Таму нам трэба спяшацца да бэтлеемскай пячоры, каб спаткацца з Хрыстом і ў Ім убачыць нашага брата. Святкаванне Божага Нараджэння не будзе мець поўнага сэнсу і тады, калі хрысціяне не будуць умець абвяшчаць Яго праз сваё жыццё іншым людзям.

Таму, як мы спяваем у папулярнай калядproperties песні, «абудзіся, беларусебратка», бо для цябе Бог нарадзіўся. Абудзіся той, хто спіць, і паўстань з грахоўнай магілы, і заяснее табе Хрыстус. Чалавек, ты памёр бы навекі, каб Ён не нарадзіўся ў час.

Аднойчы малая дзяўчынка пасля святой імшы на Божае Нараджэнне спыталася ў сваёй мамы: «Мама! Сёння нарадзіўся Пан Езус. Год таму я таксама чула, што Ён нарадзіўся. Так было і два гады таму. Колькі ж разоў Ён тады нарадзіўся?» Папа Інакенцій III на гэтае пытанне адказаў наступным чынам: «Езус нараджаецца з Бога Айца заўсёды. З сваёй маці Ён нарадзіўся толькі адзін раз. Але ў нашых сэрцах Ён нараджаецца часта».

Няхай жа нашым самым прыгожым святочным дарам і зычэннем будзе тое, каб Езус як мага часцей нараджаўся ў нашых сэрцах.

Дарагія браты і сёстры, суайчыннікі, усе людзі добрай волі!

Са святам! З Раством Хрыстовым! Ад усяго сэрца віншую вас з гэтым радасным, збаўчым святам Богаўцелаўлення, якое дае новую надзею!

Віншую католікаў і вернікаў іншых хрысціянскіх веравызнанняў, якія сёння адзначаюць гэтае свята. Асабліва віншую братоў і сясцёр праваслаўных, якія перажываюць Адвент і ў чуванні рыхтуюцца да свята Божага Нараджэння. Хоць літургічныя календары ў нас розныя, аднак сэнс свята аднолькавы, а менавіта — Богаўцелаўленне. Таксама і мы ў нашым служэнні Народу Божаму павінны быць адзінымі, каб разам сведчыць праўду Евангелля, бараніць хрысціянскія каштоўнасці і на іх будаваць нашае жыццё.

Віншую ўсіх людзей добрай волі. Бог стаўся чалавекам і збавіў усіх. Таму і наша радасць мае права быць супольнай.

Жадаю, каб Хрыстус сваёю ласкаю нарадзіўся ў нашых сэрцах, каб мы ўсе ў Ім адкрылі Збаўцу, зведалі безабаронную любоў Бога, Яго пакору і міласэрнасць, а таксама навучыліся новаму спосабу жыцця, узаемнай пашане і любові.

У гэтае збаўчае і радаснае свята заклікаю вас глыбока да сэрца прыняць словы прарока нашага часу, Вялікага Папы, благаславёнага Яна Паўла II: «Не бойцеся! Адчыніце дзверы Хрысту!» Адчыніце, бо Ён хоча нарадзіцца і быць у нашых сэрцах і іх умацоўваць сваёю ласкаю. Ён дапаможа нам лепей зразумець сябе саміх, наша грамадства і яго праблемы, каб на прынцыпах Евангелля мы маглі вырашыць іх годна, як належыць нашаму народу. Бо сустрэча з Хрыстом з'яўляецца найлепшым лекам для пагружанага ў крызіс свету. Калі нам пагражаюць духоўная засуха і смерць, у Хрысце ёсць будучыня, жыццё і радасць, навучаў папа Бэнядыкт XVI падчас свайго візіту ў Германію ў верасні гэтага года.

Пане Езу Хрыстэ, Ты сваім нараджэннем прынёс сапраўдны мір у гэты свет, адары нас сваёю ласкаю, мудрасцю і трываласцю. Няхай там, дзе праяўляецца азлобленасць, пануе любоў; дзе крыўда — прабачэнне; дзе падзел — еднасць.

Паводле старой традыцыі, у святую ноч Божага Нараджэння ваюючыя бакі на фронце спынялі агонь і нават хадзілі адно да аднаго ў госці. У гэтае свята духоўнага міру і супакою пададзім адно аднаму рукі ў імя народжанага ў Бэтлееме Збаўцы, які такім чынам прысутнічае сярод нас, паяднаемся ў імя светлай будучыні нашай Краіны. Мы ж усе яе дзеці, нам тут жыць і ісці да вечнасці.

Як залог нашай еднасці ў нованароджаным Збаўцы і новай надзеі, нават насуперак надзеі (пар. Рым. 4, 18), дзялюся з усімі вамі аплаткам і, даверяючы апецы Багародзіцы, ад усяго сэрца благаслаўляю ў імя Айца, і Сына, і Духа Святога. Амэн.

**Арцыбіскуп Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ**
**Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі,**
**Апостальскі Адміністратар**
**Пінскай дыяцэзіі.**

### Магілёў запрашае на 12-ы паверх

У святы гасцініца «Магілёў» справіць наваселле: пасля рэканструкцыі тут адкрываецца 12-ы паверх. Нумары на ім адрамантаваныя па стандартах расійскай гасцінічнай сеткі, якой належыць частка акцый магілёўскай гасцініцы. У адным з «паўлюксаў» ёсць нават саўна. Цяпер у «Магілёве» таксама дзейнічае ўласная пральня, дзе ад пастаяльцаў прымаюць заказы на чыстку адзення.

**Ілона ІВАНОВА.**

### Аўтамашыны ў чым правініліся?

**У Пінску невядомы мерна гірай прайшоўся па шклу аўтамабіля «Форд Скорпіа», які стаяў у двары дома.**

А вось у г. Мікашэвічы невядомы стрэліў з ружжа 12 калібру па аўтамабілі «Фальксваген Пасат» і зрабіў шкоду на 6 млн 600 тыс. рублёў. Хулігана шукаюць.

Жыхар жа з Лунінца, пасварыўшыся з гаспадаром а/м «Форд-Эскорт», схапіў лом і пачаў дубасіць ім па аўтамабілі. Злачынца, раней асуджаны за крадзеж, знаходзіцца ў вышуку.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# З РАСТВОМ ХРЫСТОВЫМ!

***...Вось абвяшчаю вам радасць вялікую, якая будзе ўсяму народу: нарадзіўся вам сёння ў горадзе Давідава Збавіцель, Які ёсць Хрыстос Гасподзь.***

Лк. 2, 10-11



**Сябры дарагія, браты і сёстры ў Гасподзе Ісусе!** Ізноў маю задавальненне павіншаваць вас з чарговай вяхой: у новы год уваходзіць кожны з нас — у новы год уваходзіць наша дзяржава. Але ў цэнтры ўвагі, як і раней, павінна заставацца сапраўды эпахальная падзея, якая не проста служыць трывіяльнай прычынай для ўрачыстага абмену паштоўкамі і стракатымі скруткамі, а мае пад сабой трывалую аснову, якая дазваляе думаць іншымі катэгорыямі. І калі фразу «з Новым годам!» магчыма растлумачыць менавіта як «з Новым годам!», то віншаванне «з Раством Хрыстовым!» — дэкларацыя іншага парадку. Гэтыя два кароткія словы заклікаы нагадаць чалавеку не пра ёлачную мішуру і шумную бяседу, якая мае адбыцца, а пра Госпада, які ўзышоў на крыж за грахі гэтага самага чалавека.

Як доўга будзе працягвацца радасць пасля дзікаватай песенна-шкляначнай ночы з перагружанымі сотавымі апаратамі?.. Колькі з мірыядаў навагодніх карпаратываў, хваля якіх у чарговы раз пракоціцца па краіне, пакінуць выразны адбітак у вечнасці?.. Наколькі яўнай будзе карысць ад «адзінай чароўнай» ночы ў годзе, у якую — мы прывыклі так думаць — можна дазволіць сабе крышачку больш, чым звычайна?..

Радасць пасля ціхай сардэчнай малітвы падзякі за крыжовую ахвяру захаваецца надоўга.

Шчыры зварот да Айца Нябеснага пакіне выразны адбітак і ў душы, і ў вечнасці.

Што да карысці: калі хоць бы аднойчы замест бяздумна пустога баўлення часу чалавек аддасць перавагу разважанням над вечным і зносінам з Богам — што можа параўнацца з карысцю ад такога выбару?

Рэспубліка сустрэне 2012 год. Умоўна ў 2012 раз хрысціяне ўсёй планеты адсвяткуюць Нараджэнне Хрыстова. А ў нас як у хрысціян Беларусі ёсць для суайчыннікаў цудоўная навіна. Якая, па сутнасці, зусім не новая.

Як пазбегнуць чарговай маркотнай раніцы першага студзеня ў шэрых тонах і гэтай невераГоднай унутранай спустошанасці — сімптомаў паслясвяточнай іпахондрыі? Усё вельмі проста. Святкуйце патрэбнае свята. Унікаючы ў яго сутнасць, ведаючы імя яго Героя, верачы ў сілу Яго любові.

Раства — гэта не вітрынная бутафорыя і не каляровыя лямпачкі ўздоўж праспекта. Раства — Дзень нараджэння Хрыста. Дзень нараджэння Збавіцеля ўсяго чалавецтва. З якім ад усёй душы і віншую вас, дарагія беларусы!

**Сяргей ХОМІЧ,**
**епіскап Аб'яднанай Царквы ХВЕ**
**ў Рэспубліцы Беларусь.**

**Дарагія суайчыннікі, браты і сёстры!**

Сардэчна віншую вас са святам Нараджэння Хрыстовага. Збавіцель прыйшоў у гэты свет. Пад радаснае трыумфаванне нябесных воінстваў прыйшла Добрая Вестка на арэну зямнога свету. «Хвала на вышынях Богу, а на зямлі спакой людзям добрай волі!» (Евангелле ад Лк. 2,14)



Той, пра Якога апавяшчалі старажытныя прарокі, явіўся свайму народу. Ён прыйшоў, прыняўшы вобраз раба, прыйшоў у беднаце, прыніжэнні, але знешні выгляд Яго быў толькі абалонкай, шатром для Бажаства, якое знаходзілася ў Ім. Ён пакінуў свет вечнасці і ўступіў у свет, абмежаваны месцам і часам. Вечны Бог стаў чалавекам, адмовіўшыся ад Сваёй пануючай улады над светам.

Збавіцель, Ісус Хрыстос, Першакрыніца любові не разглядаў Свой спрадвечны набытак, Свой Божы вобраз і становішча як выключна прыналежнае Яму. Наадварот, Бог аддаў Яго, каб выратаваць нас.

Яго жыццё і служэнне на зямлі сталі паваротным момантам станаўлення ЎСЯГО. Гісторыя Хрыста — гэта гісторыя ЎСЯГО. Чалавечае ўвасабленне Хрыста паклала пачатак сусветнаму Божаму фундаменту. Уступленне Госпада гісторыі ў саму гісторыю і ўзаемасувязь Нараджэння і Галгофы з'яўляецца паваротным пунктам усіх часоў, апагеем усёй любові, зыходным пунктам усяго збавення, цэнтрам усяго пакланення.

Ён прыйшоў, каб памерці за нашы грахі. Ён аддаў Сябе дзеля нашага ўратавання.

*Полный благости, полный радости*
*Благодатный день Рождества!*
*Людям дан Спаситель,*
*С Богом Примиритель.*
*Радуйтесь, настал день торжества!*

Са святам вас! З Нараджэннем Хрыстовым!

**Епіскап цэркваў Саюза евангельскіх хрысціян баптыстаў**
**у Рэспубліцы Беларусь Віктар КРУЦЬКО.**

Минский городской центр недвижимости

## Извещение о проведении 26 января 2012 г. открытого аукциона по продаже конфискованного имущества

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, характеристики продаваемого имущества)** | **Помещение транспортного назначения (гараж с подвалом) общей площадью 32,9 кв.м (инв. номер помещения 500/D-33225, инв. номер капитального строения 500/С-1207)** |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | г. Минск, проезд Масюковщина, д. 8, пом. 1024 (ГК «Таксатор») |
| **Организатор аукциона** | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, тел. (017) 227 40 22 |
| **Начальная цена** | 37 434 600 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 3 700 000 белорусских рублей |

Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется участником, выигравшим торги.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион состоится **26 января 2012 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 23.12.2011 по 24.01.2012 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефон для справок: (017) 227 40 22. www.mgcn.by**

# Калядная казка ад «Беларусбанка»

**22 снежня восем шматдзетных сем'яў з усёй краіны былі запрошаны ў Мінск на дабрачынную акцыю «90 добрых спраў», прымеркаваную да 90-годдзя ААТ «АСБ Беларусбанк».**

З 2008 па 2011 год гэтыя сем'і, у якіх выхоўваюцца як родныя, так і прыёмныя дзеці, пераехалі ў дамы сямейнага тыпу, пабудаваныя на сродкі «Беларусбанка».

Перад Калядамі хлопчыкаў і дзяўчынак разам з бацькамі вырашана было павіншаваць і ўручыць падарункі: фотаапараты, цукеркі, кніжкі і розныя карысныя для дома рэчы — ручнікі і абрусы. Вучні мінскай гімназіі №192 падрыхтавалі канцэрт, які стаў працягам калядных падарункаў у гэты дзень. Акрамя таго, маленькія госці паглядзелі сталіцу падчас экскурсіі, наведалі Рэспубліканскі цэнтр тэхнічнай творчасці і спартыўны комплекс «Мінск-Арэна».

Як адзначыў Сяргей Пісарык, старшыня праўлення «АСБ Беларусбанк», найлепшы прыклад рэалізацыі пастаўленых мэт — не прыгожыя словы і лозунгі, а канкрэтнае аказанне дапамогі людзям, якія маюць у ёй патрэбу. Тым больш калі гэта датычыцца дзяцей. Акрамя ўжо існуючых дамоў сямейнага тыпу, пабудаваных на сродкі «Беларусбанка», у бліжэйшы час плануецца здаць яшчэ чатыры. «Беларусбанк» плануе і ў далейшым удзельнічаць у аказанні такой дабрачыннай дапамогі.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**



**Старшыня праўлення «АСБ Беларусбанк» Сяргей Пісарык і сям'я Камарэнкаў з Хойнікаў. Камарэнкі гадуюць сем прыёмных і адно роднае дзіця.**

### ЛЯ ВЁСКІ — «РЭХА ВАЙНЫ»

Паблізу вёскі Макарава Віцебскага раёна знайшлі «арсенал»: сем мінамётных мін, пяць гранат РГ-42, артылерыйскі снарад і тры ўзрывальнікі часоў Вялікай Айчыннай вайны. Усе небяспечныя знаходкі былі абясшкоджаны групай размініравання.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**Утерянный представительством Белгосстраха** по Первомайскому району г. Минска бланк страховой квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) **формы 1СУ серии КС № 1179994 считать недействительным**.
УНП 101883943

**Утерянный представительством Белгосстраха** по Партизанскому району г. Минска бланк страхового полиса по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории стран — членов системы «Зелёная карта» **серии BY01A № 5533126 считать недействительным**.
УНП 101883943

ШВАБСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
**Логойского района Минской области**
ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН
**по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| № п/п | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь, га | Расходы по подготовке документов | Начальная цена (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Цна, участок № 6, 623287609601000026 | 0,2491 | 1 858 686 | 14 946 000 | 1 494 600 |
| 2 | д. Мостище, участок № 28, 623287606101000156 | 0,2238 | 1 907 704 | 12 309 000 | 1 230 900 |
| 3 | д. Мостище, участок № 29, 623287606101000157 | 0,1709 | 1 907 704 | 9 399 500 | 939 950 |
| 4 | д. Юрковичи, участок № 1, 623287611601000090 | 0,1658 | 1 907 704 | 8 290 000 | 829 000 |
| 5 | д. Таковщина, участок № 9, 623287608601000046 | 0,1887 | 1 907 704 | 9 420 000 | 942 000 |
| 6 | д. Чеботари, участок № 3, 623287610101000035 | 0,1908 | 1 907 704 | 6 678 000 | 667 800 |

Задаток перечисляется на р/с № 3600619161107, ЦБУ № 611 филиала № 500, Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 601 г. Логойска. УНП 600181592, Швабский сельский исполнительный комитет. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и земельными участками. Аукцион состоится **24 января 2012 г. в 14.00** по адресу: Минская обл., Логойский р-н, д. Швабы, ул. Парковая, д. 26.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются до 14.00 19 января 2012 года.

Контактные телефоны: (8 01774) 59 1 35, 59 2 35, моб. 8 029 107 16 17.

Наш сайт в интернете: logoysk.gov.by

**ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКАЗЕ ОТ ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОНА**
ОАО «Брестоблавтотранс» извещает об отказе от проведения аукциона по продаже комплекса недвижимого имущества, расположенного по адресу: г. Брест, ул. 2-я Заводская, 2, назначенного на 26 декабря 2011 года. За дополнительной информацией обращаться по телефонам: 29 73 95, 29 74 10, 29 72 77.

**КПУП «ГОМЕЛЬОБЛРЕКЛАМА» ФИЛИАЛ «ЭКСПЕРТ-УСЛУГА»**
**(организатор аукциона)**
**извещает, что сняты лоты № 1, № 2, № 3, № 4, № 5, № 6, № 7, № 8 с аукционных торгов, которые состоятся 28 декабря 2011 г. по решению ИМНС РБ по Железнодорожному району г. Гомеля.**
Дополнительная информация по телефонам организатора аукциона:
**8 (0232) 74 17 34, 74 89 64 и на сайте gomeloblreklama.by**

**У суд Рэчыцкага раёна Гомельскай вобл.** паступіла заява аб аб'яўленні памерлым **КАЛАЦЕЯ Аляксея Фёдаравіча**, 6 мая 1937 года нараджэння, апошняе месца жыхарства: г. Рэчыца Гомельскай вобл., вул. Камуністычнай роты, д. 64. Просім грамадзян і юрыдычных асоб, якія маюць звесткі пра Калацея Аляксея Фёдаравіча, паведаміць іх суду Рэчыцкага раёна на працягу двух месяцаў з моманту публікацыі на адрас: г. Рэчыца, вул. Леніна, 49.

